# Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у красавіку

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.**
**2 красавіка. ЦРБ ім. М.Калінковіча.** у чытальнай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі ім.Н.Калінковіча да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі адбыўся тэлемост «Дружба праз кнігу: Расія — Беларусь». Удзельнікамі сустрэчы сталі калегі з Палескай камунальнай акругі Калінінградскай вобласці. Беларускі бок прадстаўлялі дырэктар ДзУК "Лунінецкая РЦБС" Ірына Аляксандраўна Лецка, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Алена Сяргееўна Гнедзька, удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя», пераможца гарадскіх, раённых, рэспубліканскіх і міжнародных паэтычных конкурсаў Яўген Рафаловіч.
**Філіял Мікашэвіцкая ГБ.** ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Мікашэвічы імя А. У. Зайчанкі", для вучняў 5 класа прайшла бяседа "У адзінстве народаў – наша сіла".

Да **Сусветнага дня здароўя** у бібліятэках Лунінецкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшлі наступныя мерапрыемствы:
**Філіял Мікашэвіцкая ГБ**. для вучняў 2 класа ДУА «Мікашэвіцкая гімназія імя У.І. Нядзведскага» прайшла гульня «Падарожжа ў краіну здароўя».
**Філіял Лунінская СБ.** для вучняў 2-4 класаў прайшла інфармацыйная гадзіна «Здароўе пачынаецца з цябе». Бібліятэкар расказала дзецям, што кожны чалавек — сам творца свайго здароўя і таму вельмі важна з ранняга ўзросту правільна харчавацца, займацца фізкультурай, гартавацца і выконваць правілы асабістай гігіены.
**Філіял Бродніцкая СБ-К.** прайшла пазнавальная гадзіна "З гігіенай сябраваць - здаровым быць". Бібліятэкар правяла гутарку пра важнасць захавання правілаў здаровага ладу жыцця: правільным харчаванні, захаванні асабістай гігіены, пра карысць заняткаў спортам. Хлопцы чыталі вершы і прыказкі пра здароўе.
**Філіял Рэдзігераўская СБ**. прайшла гутарка "Здаровая жанчына — здаровая нацыя". **Філіял Любачынская СБ**. прайшоў урок здароўя "Здаровым будзеш — усё здабудзеш".

У бібліятэках **Лунінецкай РЦБС** прайшлі акцыі, вечары памяці, аформлены кніжныя выставы-агляды, **прысвечаныя Міжнароднаму дню вызвалення вязней фашысцкіх канцлагерэй.**

У чытальнай зале **Лунінецкай ЦРБ ім.М.Калінковіча**, для вучняў сярэдняй школы №1 г. Лунінца адбыўся ўрок-памяці "Не погаснет памяти свеча". На мерапрыемстве прысутнічалі старэйшы памочнік пракурора Лунінецкага раёна Дар'я Аляксандраўна Цібец і вязніца фашысцкага канцлагера Ядзя Фёдараўна Ярохіна. У сваім выступленні Дар'я Аляксандраўна расказала аб рабоце Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь па выяўленні фактаў генацыду ў дачыненні да беларускага народа.

Ядзя Фёдараўна распавяла пра страшныя падзеі ваенных гадоў. У завяршэнні адбыўся паказ відэароліка «Тропой войны пойдём мы вместе».

Для вучняў гімназіі і сярэдняй школы №2 г.Лунінца, адбыўся ўрок-памяці “Не погаснет памяти свеча”. У мерапрыемстве прымаў удзел вязень фашысцкага канцлагера Рудовіч Іван Іванавіч, ён распавёў пра страшныя падзеі ваенных гадоў.

**Філіял Мікашэвіцкая ГБ.** для вучняў 7 класа ДУА “Сярэдняя школа №2 г.Мікашэвічы” праведзена медыя — інфармацыя «Озаричи – не переходящая горечь и боль. Удзельнікам мерапрыемства быў прадэманстраваны відэа ролік «Озаричи – 10 дней ада» з успамінамі вязняў пра тыя жудасныя дні.

**Філіял Рэдзігераўская СБ**. правяла гадзіну-рэквіем “Помнить страшно, забыть нельзя”. Святлана Сяргееўна распавяла пра фашысцкія лагеры, якія размяшчаліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі: Трасцянец, Чырвоны Бераг, Азарычы.

**Філіял Лунінская СБ** гадзіна памяці “Голас памяці”. Удзельнікі мерапрыемства пачулі пра страшныя падзеі ваенных гадоў, інфармацыю пра вядомыя канцлагеры і пра тое, у якіх умовах даводзілася жыць вязням.

**Філіял Дрэбская СБ-К**. да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў для дзяцей быў праведзены гістарычны экскурс «Своими видел я глазами».

Напярэдадні светлага свята Вялікадня ў духоўна-асветніцкім цэнтры «Истоки» **Лунінецкай ЦРБ імя М.Калінковіча** прайшла цёплая сустрэча, якая, без сумневу, пакінула глыбокі след у душах чытачоў пад назвай «Дзень святых цудаў».

Гасцямі велікоднай сустрэчы сталі настаяцель храма Аляксандра Неўскага іерэй Аляксандр Барысаў і вучні сярэдняй школы №1г.Лунінца. Іерэй Аляксандр Барысаў распавёў дзецям пра гісторыю свята, пра значэнне Уваскрэсення Хрыстова для ўсіх вернікаў, а таксама пра традыцыі і звычаі, звязаныя з гэтым днём. Школьнікі з вялікай цікавасцю слухалі пра тое, як правільна сустракаць Вялікдзень, што сімвалізуюць фарбаваныя яйкі і кулічы, і чаму ў гэты дзень прынята радасна вітаць адзін аднаго словамі «Хрыстос Уваскрэс!».

**Філіял Мікашэвіцкая ГБ**. у рамках праграмы «Пусть доброты прибавиться на свете» для ўдзельнікаў клуба маладых інвалідаў «САМИ» прайшла святочная сустрэча «Вялікдзень вялікі і светлы».

**Да Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін у бібліятэках** ДУК «Лунінецкая РЦБС» прайшлі інфармацыйна-пазнавальныя мерапрыемствы.

У чытальнай зале **ЦРБ ім. М.Калінковіча** для вучняў аграрнага каледжа г.Лунінца адбылася сустрэча з краязнаўцам, пісьменнікам і даследчыкам Лунінецкага раёна Сцяпанам Няфідовічам.

**Філіял Любанская СБ** краязнаўчае падарожжа “Дзіўнае месца” і разам з бібліятэкарам вучні Любанскай сярэдняй школы наведалі царкву Нараджэння Прасвятой Багародзіцы в. Лахва.

**Філіял Дрэбская СБ-К** праведзена гадзіна краязнаўства “Помнікі — памяць аб мінуўшчыне”. Дзеці даведаліся пра гісторыю гэтага свята, дэвізам якога з'яўляюцца словы: “Захаваем нашу гістарычную Радзіму”.

**Філіял Сінкевіцкая СБ** праведзена гістарычнае падарожжа “Памяць зямлі беларускай”. Для дзяцей арганізавалі экскурсію ў вёску Сітніцкі Двор.

**Філіял Рэдзігераўская СБ** прайшла краязнаўчая гадзіна “Скрозь стагоддзі: помнікі нашага краю”.

**24 красавіка. ЦРБ ім.М.Калінковіча** прыняла ўдзел у культурна-асветніцкай акцыі ў падтрымку чытання “Бібліяноч – 2026”. Сёлета знакавая падзея была прысвечана Году беларускай жанчыны.

У гэты дзень раённая бібліятэка пашырыла фармат сваёй працы і прадставіла наведвальнікам незвычайную культурную праграму: займальную квэст-гульню “По следам белорусской женщины”, літаратурна-паэтычны вечар, майстар-клас, разнастайныя кніжна-ілюстраваныя выставы і фотазону, якія падкрэсліваюць вобраз жанчыны.

Бібліятэкар Алена Велясніцкая правяла майстар-клас «Майстэрня жаночага натхнення» і пазнаёміла з тэхнікай і схемамі вышыўкі крыжыкам і пацеркамі.

Галоўнай падзеяй акцыі стаў літаратурна-паэтычны вечар «У паэзіі жаночая душа». У рамках мерапрыемства адбылося ўзнагароджанне пераможцаў раённага конкурсу паэзіі і прозы «Пра каханне, пра маму, пра вясну», прысвечанага Міжнароднаму жаночаму дню 8 сакавіка, прымеркаванага да Года беларускай жанчыны. Дыпломы і памятныя падарункі ўручылі старшыня раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Раіса Якаўлеўна Мазырчук і загадчык сектара культуры Лунінецкага райвыканкама Таццяна Іванаўна Лівінец. (*г.Лунінецкія навіны №32 ад 30.04.2026 г. с.17*)

Напярэдадні 40-й гадавіны **Чарнобыльскай катастрофы** ў бібліятэках ДУК “Лунінецкая РЦБС” прайшоў цыкл памятных мерапрыемстваў.

**Лунінецкая ЦРБ ім. М. Калінковіча**, адбылася інфармацыйная гадзіна “Урокі Чарнобыля – погляд праз дзесяцігоддзі” з вучнямі дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. Прысутныя азнаёміліся з храналогіяй трагічных падзей 26 красавіка 1986 года, даведаліся аб асноўных версіях прычыны выбуху рэактара, маштабах экалагічнай катастрофы і прымаемых мерах для ліквідацыі наступстваў аварыі.

Для выхаванцаў Лунінецкага ТЦСАН у **Лунінецкай ЦРБ ім. М.Калінковіча** адбыўся інфармацыйны агляд «Чарнобыль учора і сёння». Прысутныя праслухалі гісторыю трагедыі, пра ўплыў радыяцыі на чалавека ў Чарнобыльскай зоне адчужэння. Бібліёграф Ала Аляшкевіч правяла агляд кніжнай выставы»Чарнобыль нашай памяці".

Філіял Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка ў ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Мікашэвічы імя А. У. Зайчанкі” для вучняў 10 класа правяла ўрок памяці “Доўгае рэха Чарнобыля”. (*сайт газеты Лунінецкія навіны 30.04.2026г.*)

**Філіял Лунінская СБ** гадзіна памяці “Пока Чернобыль глядит в наши души”.

**Філіял Дрэбская СБ-К** для вучняў 3-4 класаў была гадзіна памяці «Чарнобыль — катастрофа стагоддзя».
**Філіял Дварэцкая СБ** урок-рэквіем "Чарнобыль: горкая праўда і вечны боль".
**Філіял Дзятлавіцкая СБ** урок памяці "Катастрофа XX стагоддзя: Чарнобыльская АЭС нашай памяці".

**30 красавіка. ЦРБ ім. Н. Калінковіча** ў рамках Года беларускай жанчыны адбылася пазнавальная сустрэча – гутарка, прысвечаная адной з самых важных тэм - «Жанчына і здароўе: баланс і клопат» з вучнямі з СШ № 1 г.Лунінца. Мерапрыемства прыцягнула ўвагу многіх, хто імкнецца да гармоніі і дабрабыту. Госцем і вядучай гутаркі стала ўрач-псіхолаг, кіраўнік Цэнтра дружалюбнасці падлетка «Сейчас» Санюковіч Вера Эдуардаўна. Вера Эдуардаўна падзялілася каштоўнымі ведамі і практычнымі парадамі, раскрываючы нюансы жаночага здароўя, падкрэсліваючы важнасць дасягнення ўнутранага балансу і пастаяннага клопату пра сябе. Гэтая сустрэча стала не толькі крыніцай карыснай інфармацыі, але і платформай для абмену вопытам і падтрымкі, нагадваючы пра тое, што клопат пра сваё здароўе-гэта інвестыцыя ў шчаслівую будучыню.